

# САСНОЎСКІ Уладзімір Уладзіміравіч

(25.01.1923-2002)

Уладзімір Уладзіміравіч Сасноўскі нарадзіўся 25 студзеня 1923 года ў в.Каменка Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Да пачатку вайны працаваў на абарончым заводзе ў Ленінградзе. Затым прымаў удзел у работах па абароне горада на Няве ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У 1942г. быў накіраваны на вучобу ва Уладзімірскае пяхотнае вучылішча. Уладзімір Сасноўскі ўдзельнічаў у баях за вызваленне Украіны, Польшчы ў саставе ІІ Украінскага, а затым ІІ Беларускага франтоў.
Разведчык-кулямётчык Сасноўскі быў двойчы паранены. Вельмі цяжкае раненне атрымаў у баях за вызваленне Польшчы.

Прайшоўшы вайну, пасля дэмабілізацыі Сасноўскі У.У. скончыў Гродзенскую фельчарска-акушэрскую школу, а затым і медінстытут.

У 1966 годзе ўзначаліў Сынкавіцкую ўчастковую бальніцу, дзе працаваў да выхаду на заслужаны адпачынак.
Памер у 2002 годзе, захаронены на могілках г.Слоніма.